# «"Я – ПАДАРОЖНІК У ЧАСЕ". ЯКУБ КОЛАС: ПАЭТ І ЧАЛАВЕК»

Так называўся навукова-папулярны фільм, прагляд якога адбыўся ў межах Фестывалю беларускага слова падчас пасяджэння кінаклуба.

У кінастужцы (рэжысёр і аўтар сцэнарыя Сяргей Лук'янчык), якую прадаставіла ўнітарнае прадпрыемства «Кінавідэапракат» Віцебскага аблвыканкама, аповед пачынае загадчыца філіяла «Мікалаеўшчына» Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа С.П. Міцкевіч. Соф'я Пятроўна расказвае пра гісторыю нараджэння Якуба Коласа, прадказанне жабрачкі, далейшы лёс творцы. Затым пляменнік класіка Георгій Міхайлавіч Міцкевіч распавёў пра дзядзьку Якуба Коласа – майстра на ўсе рукі Антося. Менавіта апошні сплёў саламяны куфэрак, з якім будучы пісьменнік паехаў паступаць у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, а потым ніколі з ім не расставаўся. На жаль, праз некаторы час на станцыі Ціхарэцкая ў класіка ўкралі падараваны дзядзькам куфэрак, дзе захоўваўся рукапіс паэмы «Сымон-музыка», і Якубу Коласу давялося ўзнаўляць тэкст па памяці.

Цікавыя факты з жыцця пісьменніка распавяла дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа З.М. Камароўская, якая зазначыла, што, калі наступае ноч, у музеі можна адчуць прысутнасць народнага паэта: чутны яго крокі.

Пасля прагляду фільма хлопцы і дзяўчаты падзяліліся сваімі думкамі, абмеркавалі ўбачанае. Некаторыя прызналіся, што многія факты з жыцця пісьменніка яны ўвогуле не ведалі. Запомніўся прысутным і голас Якуба Коласа падчас прамовы на святкаванні свайго 60-годдзя.

«Ёсць дзве рэчы, якія ўздымаюць мне настрой: добра напісаны верш і дождж, які прайшоў у час», – зазначыў калісьці класік. Завяршылася сустрэча на паэтычнай ноце: першакурснікі Наталля Ермакова, Кацярына Андросава, Павел Лазараў, Анастасія Марозава, Марыя Салавей прачыталі вершы пісьменніка.

**Аліна КАРПЫЗІНА,**
**студэнтка 1 курса ФлФ.**
**Фота А. ДУБРОЎСКАЙ.**

